Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р, 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна також падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей,, хто нл захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. — 8 Жніуня 1914 г. — № 31

**Прыймаецца далей падпіска на „Нашу Ніву“ на 1914 г.**

Цэна на год—2 р. 50 кап., на 6 мес.—1 р. 25 к., на 3 мес.—65 к., на 1 мес.—25 кап.

*Адрэс: Вільня, Віленская 29.*

## АДОЗВА

### Вярхоунаго Глаунакаманду-ючаго да палякоу.

Палякі! Прабіла гадзіна, калі адвечная думка бацькоў і дзядоў вашых можэ споўніцца. Паўтара сталецьця таму назад жывое цела Польшчы было раздзерта на часці, але ня ўмёрла душа яе, жыла яна надзеяй што настане час уваскрэсеньня польскаго народу і братняго прымірэньня яго з Вялікай Расеяй. Расейскае войска нясе вам добрую вестку гэтаго прымірэньня. Ніхай сатруцца межы, разрэзаўшые на часці польскі народ! Хай злучыцца ён у адно пад бэрлам Расейскаго Цара і пад бэрлам гэтым адродзіцца Польшча — свабодная у сваей веры, языку і самоупраўленьні. Аднаго чэкае ад вас Расея: такой-жэ пашаны да правоў тых народнасьцёў, с каторымі звязала вас гісторыя. З аткрытым сэрцам і па братэрску выцягнутай рукой ідзе да вас Вялікая Расея. Яна верыць, што не заржавеў меч, каторы біў ворага пад Грунвальдам. Ад берагоў Ціхога Акеяна да Паўночных марэй цягнуцца расейскіе палкі.

Золак новаго жыцьця усходзіць для вас. Хай заблішчыць у гэтым золаку знак крыжа—гэтаго сымволу мук народоў і іх уваскрэсеньня.

Глаўнакамандуючый генерал-ад'ютант МІКАЛАЙ.

## Расейскі протэкторат над палякамі.

Глаўнае упраўленьне генеральнаго штабу афіціяльна паведамляе:

Аўгусцейшы вярхоўны глаўнакамандуючый загадаў паведаміць усё войско чыннай арміі і жыхароў, што Расея ваюе па выzаву агульна-славянскаго ворага. Палякі, як на расейскай тэрыторыі, так і ў межах Нямеччыны і Аўстрыі, выказаўшые сваю лояльнасць (прыхільную паслушнасць), будуць знаходзіцца пад асобнай апекай нашай арміі і правіцельства у значэньні абаспечэньня іх асабістай і іх маетнаснай баспечнасці ад ўселякіх гвалтоў. Усякіе нарушэньня асабістых і маетнасных правоў палякоў, ня ўлічэных у варожых да Расеі дзействах, будуць карацца па усей срогасці закону ваеннаго часу.

## Перад бітвай мільенау.

—о—

С кожным днём набліжаецца той страшэнны момэнт, калі аграмадные арміі вялікіх дзержаў—па мільёну душ—кінуцца адна на адну.

Дагэтуль былі больш невялічкіе бітвы. Толькі пад бельгійскім горадам Льежам лягло каля 20 тысяч немцоў: гэта была першая вялікшая ахвяра богу вайны.

Вайна вядзецца на двух канцох Нямеччыны: на граніцы з Расеяй—на ўсходзі, на граніцы с Францыяй і ў Бэльгіі—на захадзі.

На ўсходзі немцы йдуць поруч з аўстрыйцамі. Нямецкае войска стаіць на пагранічча Ковенскай, Сувальскай і Ломжынскай губэрній ды пасунулося глыбей у Калішскай і Петракоўскай. Далей на поўдні ў Польшчу ўвайшлі аўстрыйцы і гаспадаруць у палудзеннай часьці Келецкай губэрні ды нават даходзілі да Сандоміра, Радомскай губ., але іх адтуль выціснуло расейскае войска. Ешчэ адна аўстрыйская армія наступае на Валынь і Падольле, але супроць іх стаіць расейскае войска, дык і загарадзіло ім дарогу. А між абедзьвымі аўстрыйскімі арміямі клінам урэзалася армія расейская: расейскіе каманды перайшлі на аўстрыйскую зямлю, дайшлі да гораду Сокаля на рэцэ Бугу (па дарозі да Львова), разбілі тутака аўстрыйцоў, спалілі станцію, зруйнавалі два масты і тады адступіліся. І ўсё-ж такі вялікай бітвы ні з аўстрыйцамі ні з немцамі—ад каторай залежыць мо ўся вайна,—ешчэ не было: яе чакаюць з дня на дзень ды рыхтуюцца і расейцы, і немцы, і аўстрыйцы. Толькі ўзятые ў няволю непрыяцелі ды раненые салдаты, каторых пачалі ўжо прывазіць з пад граніцы, сьведчуць аб безупынных дробных бітвах, у каторых ліецца ўжо кроў чалавечча.

На заходзі немцы пайшлі на Францію ня проста, а праз суседняе каралеўства Бэльгію. Гэта затым, што граніца між Францией і Нямеччынай дужа узмацавана французамі, а на граніцы Бэльгіі, каторая клінам уходзіць між ваюючымі дзержавамі, зусім мала крэпасьцей. Затое ёсць моцные крэпасьці ў самай Бэльгіі,—і вось яны спынілі паход нямецкіх войск больш чым на нядзелю. Усе апошніе бітвы ішлі найбольш пад Льежам, на каторы немцы перш-наперш напалі.

Цяпер немцы, заняўшы горад Льеж (крэпасць яшчэ дзержыцца), пакінулі тамака толькі частку войска, а другая часць пайшла проста на сталічнае места Бэльгіі—Брюссэль. Адтуль ужо выехаў бэльгійскі кароль с сямьёй, увесь урад і паслы чужых дзержаў у вялікую і моцную крэпасць Атвэрпэн. Але каля Брюссэля немцам бадай, прыдзецца біцца ужо не з аднымі бэльгійцамі: пакуль ішлі бітвы каля Льежу, у Бэльгію Францыя і Англія паслалі багата войска,—і вось гэтае войска ужо злучылася з бэльгійскім. Хто каго зваюе, пакажуць бліжэйшые дні.

Надумаўшы перайсьці у Францію праз Бэльгію, немцы ўсё-ж такі ня кінулі думкі напасьці на Французоў і на іх ўласнай граніцы. Ім, папраўдзі, удалося ўварвацца на французскую зямлю цераз правінціі, калісь забраные ад Франціі, — Эльзас і Лотарынгію. Але далёка не зайшлі: французы навязьлі у гэты бок багата войска—ажно з сваіх колоній у Афрыцы, ды цяпер самі йдуць на немцоў, каб перанесьці вайну з сваей старонкі ў Нямеччыну.

Больш двух мільёноў душ могуць немцы сабраць на захадзі, ды гэтулькі маюць французы поруч з англічанамі і бэльгійцамі. На аграмадным абшары раскінуліся гэтые арміі,—на сотні вёрст цягнецца фронт іх. І патрэбен толькі сыгнал, каб гэтые мільёны кінуліся адны на адных...

Гэта будзе запраўды бітва мільёноў—бітва, якой ешчэ не бачыў сьвет.

# ВАЙНА.

### Руска-Нямецкая.

28 і 29 ліпня немцы рабілі усіленные разведкі на граніцах Ковенскай і Сувальскай губэрній.

Нямецкі атрад сілай больш чатырох батальёноў, 18 гармат і трох эскадроноў напаў на Эйдкунэн, але быў адбіты.

Брыгада нямецкай пяхоты памыкалася заваладзець пасадам Філіплово; батальён нямецкі наступаў на Юрбург.

— Глаўнае упраўленьне глаўнаго штабу афіціяльна паведамляе, што на граніцы Сувальскай і Ковенскай губэрній спроба непрыяцеля аттакаваць Эйдкунен атрадамі пяхоты і артылерыі адбіты. Непрыяцель адступіўся Узята ў палон, а такжэ ранена і забіта многа немцоў. Бой быў даволі гарачы

30 ліпня нашымі вайскамі збурэна у 11-ці мейсцах жалезная дарога і тэлеграфная лінія Тільзіт-Шмакенінкен.

Паміж Шырвінтамі і Кузьменам, у Кармушыне выкрыта часці 1-го уланскаго і 9-го коннаегерскаго нямецкіх палкоў с пулямётамі. Пры прыбліжэньні да іх нашых часцей, нямецкае войска, укланіўшыся ад бою, адступіло.

Два батальёны і 6 гармат супраціўніка, с коніцай наступалі на Філіппов.

У Маркграбове адбіты часці нямецкай пяхоты, артылерыі і конніцы.

— У Сувальскай і Ковенскай губэрніях нашае войска карысна змагаецца з разведчыкамі нямецкімі, каторые лётаюць у паветры.

1-го жніўня два нямецкіх контрмінаносцы безкарыстна абстрэлівалі таможню у Полангене.

Нямецкая конніца збіраецца каля Пілкаленя і Хомэнтова, пяхота—каля Сталупенена.

Каля Сімна падбіт нямецкі аэроплан; чатыры лётчыкі знайдзены забітымі.

4 жніўня. Глаўнае упраўленьне генеральнаго штаба афіціяльна паведамляе: Пачаўшыйся раніцай 2-га жніўня бой пад Эйдкуненам цягнуўся да вечэра, нашымі вайскамі утрыманы усе пазыціі. Нямецкае войска сцягіваецца да Пількалена.

У Бітве пад Кельцамі нашэ войска прымусіло да атступленьня аўстрыяцкую кавалерыйскую дывізію у поўным складзе. У той-жэ дзень наступаўшый на ўсход ад Сандаміра аўстрыяцкі атрад астанавіўся. Наша конніца аткінула аўстрыяцкі атрад, сунутый у кірунку да Томашэва і прымусіла яго с сур'ёзнымі стратамі для праціўніка адыйсціся да Нароля, дзе быў высечэн эскадрон 11 драгунскаго аўстрыяцкаго палка. Новая спроба праціўніка пасунуцца да Томашэва была без рэзультату.

Наступаўшые у гэтым кірунку 11 аўстрыяцкі гусарскі полк і батальён 4 пяхотнаго палка, пры двух гарматах, пад націскам нашых войск атступілі да Нароля. Пасьля упорнай абароны праціўнікам Блежэца і Любуша былі ўзяты з бою нашай конніцай. Проці Каменца-Падольскаго конные часці аўстрыякоў, каторые робяць разведкі, укланяюцца ад стычак. Каля станціі Блін, Падольскай дарогі, узят аўстрыяцкі аэроплан з афіцерам і салдатам-

### Руска-Аустрыяцкая.

30 ліпня Генеральны Штаб паведаміў, што аўстрыяцкіе пяхотны і уланскі палкі выбіты с сялібы Золожцэ, каторая знаходзіцца на поўдне захадзі ад Радзівілова. Каля Збаража высечэна застава 15 аўстрыяцкаго пяхотнаго палка; астатакі аўстрыяцкай роты у беспарадку уцяклі. Поўэскадрон аўстрыяцкаго 12 уланскаго палка, перайшоўшый на нашу граніцу каля Волочыска, быў аттакованы намі і страціў 16 чэлавек забітымі; палоннікамі-ж—афіцэра і трох салдатоў. За Днестрам ўзвод аўстрыяцкаго восьмаго уланскаго палка быў такжэ аттакованы намі і пакінуў 10 забітых. Сурьёзных стычэк на Расейска-Аўстрыяцкай граніцы ешчэ не было, але дзякуючы нашым часцічным удачам Радзівілоў аўстрыякі пасьпешна пакідаюць.

— Аўстрыяцкае войска на францускім фронце аддадзена пад загад нямецкаму глаўнакамандуючаму.

На рускім фронце нямецкае войска акапываецца каля Каліша, Конецпольля і Серадя, руйнуючы перэправы праз рэку Варту.

Спроба Аўстрыякоў прыблізіцца да нашых на палудзень ад Збаража была адбіта агнём нашаго войска. Атступаючы, праціўнік меў страты.

### Французка-Нямецкая.

Бой на рэцэ Отэн, каторы пачаўся 29 ліпня, цягнуўся 30 ліпня з вялікай карысцю для французоў. Першым чынам немцы аттакавалі два французкіх батальёны. Французы спачатку атступілі, але пасьля атрымаўшы падмогу, ноччу зрабілі контраттаку і прымусілі немцоў пасьпешна атступіць. Немцы страцілі многа забітымі, раненымі і паланёнными, кінулі батарэю артылеры, тры пулямёты і колькі скрынак з набоямі.

30 ліпня французская батарэя, захапіўшы неўспадзеўкі спешэнны 21 нямецкій драгунскій полк, зніштожыла яго.

Вынік гэтых удач зара выявіўся на руху нямецкіх сіл у гэтай аколіцы: іхніе калонны пачалі атступаць, гнаные французамі. Дзевяць афіцэроў і каля тысячы салдатоў раненых і паланённых асталіся у руках французоў.

### Сэрбска-Аустрыяцкая.

Сэрбы мелі вялікую удачу над Аўстрыякамі у Босьніі. Аўстрыякоў аткінулі з вялікімі стратамі у 8 стычках. Многа салдатоў славяноў, што служуць у арміі аўстрыяцкай, атказаліся біцца с Сэрбамі. Гэтае нездаволеньне салдатоў славяноў, заувважэна ужо раней у войску аўстрыяцкім і узрастае с кожным днём. Сэрбскае войска заняло 9 вёсак у Босьніі.

— Ужо другі дзень чорнагорскае войска вядзе зацятое змаганьне за заняцьце пазыціі на гарэ Лізаніны у аколіцы Грахова. Аўстрыякі аттакуюць не малымі сіламі.

— Сэрбы занялі Сухую Гару каля Вышэграду і Буяк каля рэкі Ліча, адкінуўшы усюды непрыяцеля.

Аўстрыякі перакінулі мост праз Дрыну і ўзмацавалі пазыціі на абадвых берагох рэкі.

### На моры.

Французская эскадра аттакавала аўстрыяцкі флот у аткрытым моры. Два броненосцы аўстрыяцкіе затоплены, трэці гарыць, чацьвёрты уцалеў уцекаючы. Бітва трывала болей гадзіны.

### Вялікая бітва.

Ангельскіе газэты пішуць, што на Бэльгійскай тэрыторыі пачалася першая вялікая бітва, у каторай прынімае учасьця два мільёны людзей.

У гэтай бітве прыймаюць учасьця 21 корпус французскі і 3 бэльгійскіе корпусы з аднэй стараны. З другой 25 корпусоў нямецкіх і адзін аўстрыяцкі. У кожным корпусе каля 40 тысяч людзей.

### Ультіматум Японіі.

Нямецкаму пасланніку пададзена ультіматум японскаго правіцельства. У гэтым ультіматум Японія вымагае разаружэньня ваенных нямецкіх караблёў і крэпасьці Кяо-Чао. (Гэта нямецкая крэпасць у Кітаі) а такжэ каб немцы аддалі Кяо-Чао японцам не далей як праз месяц без ніякай платы. Тэрмін на атказ сямідзённы, да 10 числа гэтаго месяца.

### Як доуга патрывае вайна.

Ангельская газэта „Times“ пішэ, што чэканая вялікая бітва патрывае са два тыдні. Знатакі ваенных спраў кажуць, што кожны дзень, адцягіваючый вялікую бітву, прычыняецца да аслабленьня нямеччыны. С прычыны блокады з мора і с сушы час прыгатаўляе нешчасьця немцам.

### Ваенные дабычы.

У Вільню прывезены пяць нямецкіх пулямётоў і другое аружжа.

### Бэльгійска-Французска-Нямецкая вайна.

Выдаўшы вайну Расеі немцы думалі перайспі праз Бэльгію і напасці на Францію і ісці проста у Парыж, але Бэльгія ня згодзілася прапусціць нямецкае войска праз сваю зямлю. Тады немцы пастанавілі прымусам дабіцца згоды на гэта у Бэльгійцоў і выдалі ім вайну. Тры нямецкіе корпусы (каля 120,000 душ), уваліліся у Бэльгію са стараны нямецкаго гораду Аквізграну і падыйшлі пад умацованае места, Льеж, над рэкай Мозай. Немцы хацелі там перэправіцца праз рэку і заняць чугунку што вядзе у Парыж. Ня думалі, каб крэпасць Льеж, бароненая 40,000 бэльгійскаго войска магла іх стрымаць, і прамахнуліся. Усе штурмы немцоў бэльгійцы адбілі з вялікімі стратамі для немцоў. Войска Бэльгійскае біецца з вялікім раз'юшэньнем і мужэствам, а войску памагаюць акалічные жыхары з вёсак і мястэчак, каторые гэтак сама хапіліся за аружжэ. Пасьля колькадзённых штурмоў Немцам удалося у канцы дабыць колькі фортоў акружаючых Льеж і ўламацца у горад. Але пабеда гэта ня поўная, бо большая частка фортоў астаецца і дагэтуль у руках Бэльгійцоў. Дагэтуль як самі немцы прызнаюцца страт мелі яны каля 20,000 людзей (забітых і раненых). Бэльгійцы забралі у немцоў 24 гарматы і узялі у няволю аднаго генерала. Увыйшоўшы у горад Немцы прасілі камандуючаго бэльгійскім войскам аб прымірэньню на адзін дзень, каб пахаваць забітых і падабраць раненых. Тымчасам бэльгійцам пачала прыходзіць падмога с Франціі і Англіі. У канцы сабралося мільёны войска з аднэй і другой стараны. Цяпер там ідзе бой мільёноў. Усяго мае быць з абодвых старон болей 2-х мільёноў войска. Пакульшто вестак аб гэтым бою ешчэ німа.

Калі так ваююць Немцы з Бэльгійцамі, каторые пастрымалі паход Немцоў на Францію, французскае войска перайшло граніцу нямецкую і ўваліілося у Альзацію, старонку забраную ад Франціі Немцамі у 1870 гаду. Пабіўшы Немцоў пад мястэчкам Альткірхам французы пайшлі далей і гэтаго-ж ешчэ дня занялі вялікае фабрычнае места Мільгузу. Выціснутые з Мільгузы Немцы адступілі да крэпасьці Новы-Брэйзах, палючы па дарозі склады з запасамі харчоў і пашы. Цяпер ужо у руках Французоў безмала уся сярэдняя Альзація. На падмогу Немцам Аўстрыя паслала 3 корпусы свайго войска і вось за гэта Францыя абвесціла Аўстрыі вайну.

## З Беларусі і Літвы.

С прычыны выезду глаўнакамандуючаго 1-й арміей Генерал-ад'ютанта Рэнэнкампфа з Вільні на тэатр вайны, яму паднеслі ікону і віленскі губэрнатар сказаў пры гэтым стасоўную прамову.

### Шышы (марудэры).

Вайна вытварыла новые спосабы ашуканства. Паявіліся людзі, каторые распускаюць фальшывые чуткі дзеля сваей карысьці.

Гэтак у віленскім павеці пачалі распускаць сумысля чуткі, што у скорым часе правіцельство пачне забіраць атсюды ад селян скаціну.

С прычыны гэтых чутак, ня толькі селяне, але нават памешчыкі пачалі прывадзіць на мейсцовые рынкі многа скаціны. Само сабой, што цэны на скаціну палі, і гандляры за карову, вартую 90—100 рублёў, плацілі ня болей 40 - 50 руб.

Другі раз пусьцілі чуткі, што віленскае інтэнданцтва будзе закупляць многа сена. І вось пацягнуліся у Вільню вазы с сенам. Само сабой у Вільні гаспадаром прышлося сена прадаваць за поў цаны, дзеля таго што сена было болей на рынку, як ахвотнікоў купляць яго.

З гэткім марудэрствам змагацца дужа цяжка, бо лягчэй зваеваць найдужэйшаго ворага, чым розные выдумкі у часе вайны. Не дармо-ж кажэ прыказка, што „у мор—намруцца, а у вайну—налгуцца“ людзі. Але усё-ж такі да ўсякіх чутак трэба аднасіцца дужа асцярожна і з вялікім спакоем, ды змагацца з рознымі фальшывымі чуткамі.

### Мобілізацыя падушак.

Апошнімі днямі паміж жыхароў Вільні пайшлі чуткі аб тым, што бытцым паліціі загадалі сабраць у жыхароў Вільні падушкі, наўлечкі і посьцілкі на патрэбы ваенных лазарэтоў. Пры гэтым расказывалі, што на кожнаго чэлавека будзе пакінута толькі па аднэй падушцы, пасцілцы і наўлечцы.

Аказалося, што і запраўды нейкая банда шышоў хадзіла па кватэрах і адбірала ад жыхароў падушкі і пасцельную бялізну. Цяпэр гэтую банду шышоў ловіць паліція.

### Аб асыгнацыях.

Камандуючый арміей генерал-ад'ютант Рэнэнкампф выдаў абавязываючае пастанаўленьне для жыхароў віленскай губэрні гэткаго зместу: „Забараняецца атказывацца прынімаць пры платах гасударственные крэдытные білеты (паперовые грошы), ці прыймаць іх па зніжэнай вартасьці. Забараняецца прыватным банкам, банкірскім канторам, разменіваючым крамам і прыватным асобам браць якую небудзь лажу за размен крэдытных білетоў на зьвінячую манэту.

Вінаватые у нарушэньні гэтаго абязываючаго пастанаўленьня, будуць штрафаваны да 3 тысяч рублёў або саджэны у турму ці у крэпасць на 3 месяцы.

Гэтае абавязываючае пастанаўленьне ўступае ў сілу з 28 ліпня 1914 г.

## Зацьменьня.

8 чысла гэтаго месяца будзе зацьменьня сонца. Зацьменьня будзе поўнае і найлепей відаць яго будзе у нашым краю. Людзі заззвычай любюць звязываць знакі на небі з забабоннай верай, у ўплыў іх на жыцьцё людзкое. Лішне хіба будзе гаварыць, што гэткая вера німае пад сабой ніякаго грунту, бо зацьменьня гэта не прыпадковае якая рэч, а з гары вядомая: астранамы вылічаюць зацьменьня на сотні гадоў уперад, што да мінуты, бо зацьменьня залежаць ад руху нябесных цел—зямлі, сонца, месяца і што нейкі час акуратна паўтараюцца.

У часе зацьменьня трэба перэсцерэгаць людзей, каб не глядзелі голымі вачамі на сонцэ, бо многа людзей ад гэтаго на заўсёды сьлепне. Глядзець на сонцэ можна праз чорнае, робленае да гэтаго сумысьля, або закопчэна сажай шкло.

## З усіх старон.

### Процi пьянства.

Рада міністроў апрабавала праект міністра ўнутрэнных спраў аб выданьні абавязываючаго пастанаўленьня проці пьянства. Праектам забараняецца піць гарэлку у публічных мейсцох, паказывацца у людзі пьяным, мець запасы гарэлкі прыватным асобам і інш.

### Павышэньне акцызу.

Міністру фінансоў Рада Міністроў паручыла, згодна з законам 30 ліпня 1914 г. завясці павышэную акцызу на гарэлку, віно, піва і табаку.

### Шышы.

У Лібаві паліція злавіла 12 шышоў, каторые грабілі пакінутые жыхарамі без апекі у Лібаўскім порце дамы. Іх аддалі пад ваенна-палявы суд і іх будуць караць сьмерцьцю праз павешэньне.

## З заграніцы.

—o—

— Цэсар нямецкі Вільгэльм выправіў у швэдзкую сталіцу Стакгольм нарочнаго пасла с пісьмом да швэдзкаго караля Оскара. У пісьме гэтым заклікае Вільгельм, каб Швэція памагла Немцам у вайне з Расеяй. Які атказ будзе швэдзкаго караля нет ведама, але швэдзкіе газэты, стаяць за тое каб Швэція не мешалася у вайну.

## Аб усім па троху.

Прафэсар Шарль Рышэ, калісь раней ешчэ падлічыў кошт эўропэйскай вайны.

— Калі прыдзе час сьветавой вайны, то вялікіе эўропэйскіе дзержавы змобілізуюць 20 мільёноў салдатоў, прычым 10 мільёноў будуць на полю бітвы. Пракорм войска будзе каштаваць штодзень 50 мільёноў франкоў (франк 40 кап.), пракорм каней—4 мільёны франкоў, пэнсіі — 17 мільёноў франкоў, плата работнікам арсэналоў і аружэйных фабрык—4 мільёны франкоў, перавозка харчоў і аружжа—16 мільёноў фр., перавозка карабельнай артылерыі —1 с пал. мільёноў фр., утрыманьне бальніц—2 мільёны фр., падмога семьям салдатоў—35 міл. фр., пераезды караблёў—2 міл. фр, і інш. У канцы канцоў кошт эўропэйскай вайны дасцігне, паводле вылічэньня прафэсара Рышэ, 275 мільёноў франкоў у дзень.

### Сілы на сушы ваюючых дзержаў.

У „Ведамасцях Імпэратарскай Мікалаеўскай Акадэміі“ (№ 39), памешчэна статыстыка ваенных сіл на сушы, с каторай відаць, што Расея мае абучэнных салдатоў 7,668,000 душ.

Францыя 4,838,000 душ.
Аўстрыя 2,243,000 »
Немеччына 5,252,000 »

Гэта значэ Расэя і Францыя узятые разам маюць 12,506,000 проці 7,495,000 душ войска Аўстрыі і Нямеччыны.

Прылучэньнеся Англіі да Расеі і Франціі ня многа падыйме ваеные сілы проці немцоў на сушы, бо Англія мае толькі невялічкую сухапутную армію, але затое ўся ваенная сіла Англіі на моры, тут яна найдужэйшая дзержава ў сьвеці.

Рэдактар-Выдавец
І. Луцэвіч.

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.